# Алегу Анатольевічу Трусаву

Дарагі Алег Анатольевіч, мы, сацыял-дэмакраты горада Менска, шчыра вітаем Вас у дзень Вашага 60-годдзя.

Мы добра памятаем, што Вы былі ў ліку тых людзей, якія ў канцы 1990 года вырашылі аднавіць сацыял-дэмакратычны рух у Беларусі, нанова стварыць Грамаду. З таго часу Вы застаецеся ў шэрагах тых, хто хоча бачыць Беларусь незалежнай дэмакратычнай прававаой сацыяльнай дзяржавай - членам сям'і еўрапейскіх краін. На Устаноўчым з'ездзе партыі (2-3 сакавіка 1991 года) Вас абралі намеснікам старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады, а ў 1992-1995 гг. Вы ўзначальвалі нашу партыю. Шмат гадоў Вы годна прадстаўляеце Менскую гарадскую партыйную арганізацыю ў Цэнтральным Камітэце Грамады.

Мы добра памятаем, што Вы, дэпутат Вярхоўнага Савета XII склікання, былі сярод тых, хто закладваў падмуркі незалежнага быту Беларусі, узаконьваў у якасці дзяржаўнай нашу нацыянальную сімволіку, змагаўся за дзяржаўны статус беларускай мовы, за стварэнне ў Беларусі свайго войска, сваёй фінансавай і банкаўскай сістэмы ды іншых атрыбутаў дзяржаўнай самастойнасці.

Сваю палітычную і дзяржаўніцкую дзейнасць Вы плённа спалучаеце з навуковай і культурна-асветніцкай працай. Гісторык, археолаг, кандыдат гістарычных навук, Вы з'яўляецеся аўтарам больш як 150 навуковых і навукова-папулярных публікацый. Самастойна або ў суаўтарстве з калегамі Вы напісалі больш за 10 кніг з гісторыі матэрыяльнай культуры Беларусі і этнаграфіі.

Сваімі ведамі Вы, дацэнт Беларускага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, шчодра дзеліцеся са студэнтамі, са слухачамі ў іншых аўдыторыях.

Працуючы амаль дваццаць гадоў ва ўніверсітэце, Вы вось ужо 15 год узначальваеце Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны - аўтарытэтнае аб'яднанне, якое абараняе правы беларускай мовы, вядзе асветніцкую і выдавецкую працу і карыстаецца шырокай падтрымкай грамадзян.

У дзень Вашага 60-годдзя мы, Вашы таварышы і аднадумцы, зычым Вам, дарагі Алег Анатольевіч, добрага здароўя, працоўнага настрою, здзяйснення Вашых задум. Няхай жыццё прыносіць Вам новыя радасці, новыя адкрыцці, а з-пад Вашага пяра няхай выходзяць новыя артыкулы і кнігі.

***Менскі гарадскі камітэт Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамады).***

7 жніўня 2014 г.

***Віншую Вас, шаноўны Алег Анатолевіч, з 60-годдзем!***

Здароўя і творчасці, творчасці і здароўя Вам асабіста. Удачы Таварыству беларускай мовы, якое Вы ўдала, натхнёна ўзначальваеце.

Няхай маленькія і вялікія начальнікі краіны ўсэнсовяць: без сваёй мовы няма нацыі, дзяржавы, павагі сабе і седалу, на каторым сядзяць, - і хай па-сапраўднаму дапамагаюць беларускай мове гарэтнай.

***Валер Санько**, пісьменнік, член-карэспандэнт Міжнароднай Акадэміі энергаінфармацыйных навук.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ